Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэткультуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*для спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),напрамкаў спецыяльнасці1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка), 1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

2020

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Т.У. Дзейко,*дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай*мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 6 ад 24.01.2020);

*саветам*факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»(пратакол № 5 ад 27.01.2020)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Т.У. Дзейко

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Практыкі (азнаямленчая, рэпетыцыйна-канцэртная, педагагічная, пераддыпломная) з’яўляюцца часткай адукацыйнага працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў, працягам вучэбнага працэсу ў вытворчых умовах і праводзяцца ва ўстановах адукацыі і культуры. Практыкі напраўлены на замацаванне ў вытворчых умовах ведаў і ўменняў, атрыманых у працэсе навучання ва УВА, авалоданне навыкамі рашэння сацыяльна-прафесійных задач, вытворчымі тэхналогіямі. Практыкі арганізуюцца з улікам будучай спецыяльнасці і напрамкам спецыяльнасці.

Праграма практыкі студэнтаў з’яўляецца галоўным метадычным дакументам, які вызначае патрабаванні да практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў-выканаўцаў у культурнай сферы. Праграма распрацавана ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, адукацыйным стандартам і вучэбнымі планамі ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (напрамку спецыяльнасці), Палажэннем аб практыцы студэнтаў, курсантаў, слухачоў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2010 г. № 860.

*Мэта* практыкі – авалоданне студэнтамі практычнымі навыкамі і ўменнямі па спецыяльнасці «мастацтва эстрады (па напрамках)»,фарміраванне ў студэнтаў значных якасцей і ўласцівасцей асобы музыканта, выкладчыка, высокакваліфікаванага спецыяліста, які валодае мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрствам, неабходным для самастойнай прафесійнай дзейнасці ў якасці саліста аркестра, інструментальнага ансамбля, саліста-вакаліста і выкладчыка музыкі.

Асноўнымі *задачамі практыкі* з’яўляюцца:

– замацаванне і паглыбленне тэарэтычных ведаў на практыцы, набыццё студэнтамі практычных навыкаў і ведаў;

– вывучэнне работы базавых устаноў культуры і адукацыі;

– набыццё студэнтамі вопыту самастойнай працы ў прафесійнай дзейнасці музычнай культуры;

– накапленне студэнтамі вопыту прафесійнай дзейнасці, развіццё выканальніцкага майстэрства ў выбары сродкаў і метадаў працы;

– фарміраванне сацыяльнаактыўных адносін студэнта да прафесійнай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалоданне працэсам навучання і выхавання вучняў;
– вывучэнне педагагічнага вопыту вядучых выкладчыкаў.

Засваенне праграмы практыкі па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках) павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Вучэбная (азнаямленчая) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

*творчая дзейнасць*

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

*арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць*

ПК-18. Арганізоўваць работу творчых калектываў для дасягнення пастаўленых мэт і задач.

ПК-21. Працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам, кіравацца нарматыўна-прававымі дакументамі, што звязаны з дзейнасцю ў сферы эстрады.

**Вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

*выканальніцкая дзейнасць*

ПК-1. Удзельнічаць у якасці артыста, прадзюсара эстрадных калектываў (тэатральных, музычных) розных творчых напрамкаў.

ПК-2. Валодаць асновамі распрацоўкі эстрадных відовішчаў, канцэртаў, спектакляў.

ПК-3. Ствараць і выконваць праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі.

ПК-4. Ствараць камп’ютарныя аранжыроўкі музычных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў.

*творчая дзейнасць*

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

ПК-6. Рыхтаваць творчыя выступленні мастацкіх калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і за яго межамі.

ПК-7. Распрацоўваць і арганізоўваць творчыя праекты.

**Вытворчая (пераддыпломная) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

*выканальніцкая дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-1. Удзельнічаць у якасці артыста, прадзюсара эстрадных калектываў (тэатральных, музычных) розных творчых напрамкаў.

ПК-2. Валодаць асновамі распрацоўкі эстрадных відовішчаў, канцэртаў, спектакляў.

ПК-3. Ствараць і выконваць праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі.

ПК-4. Ствараць камп'ютарныя аранжыроўкі музычных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў.

*творчая дзейнасць*

ПК-5. Фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць сцэнарый.

ПК-6. Рыхтаваць творчыя выступленні мастацкіх калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і за яго межамі.

ПК-7. Распрацоўваць і арганізоўваць творчыя праекты.

**Вытворчая (педагагічная) практыка**

***Акадэмічныя кампетэнцыі:***

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

***Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:***

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

***Прафесійныя кампетэнцыі:***

*педагагічная дзейнасць*

ПК-8. Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны, вывучаць перадавы педагагічны і выканальніцкі вопыт, творча карыстацца ім у сваёй педагагічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-9. Працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання.

ПК-10. Планаваць працэс навучання і выхавання ў адпаведнасці з распрацаванымі нарматыўнымі дакументамі і дыдактычнымі матэрыяламі.

ПК-11. Улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

ПК-12. Выкарыстоўваць сучасныя методыкі і тэхнічныя сродкі навучання.

ПК-13. Рыхтаваць і ажыццяўляць справаздачныя заняткі па вучэбнай дысцыпліне ў форме акадэмічных канцэртаў, творчых паказаў.

ПК-14. Карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і інавацыямі ў навучанні.

ПК-15. Удасканальваць сваё педагагічнае майстэрства.

Пасля праходжання вучэбнай (азнаямленчай) і вытворчай (рэпетыцыйна-канцэртнай, педагагічнай і пераддыпломнай) практык студэнт павінен *ведаць:*

– мастацкі рэпертуар калектываў;

– праграмы з litрознахарактарнымі твораміў розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

– вучэбныя планы і праграмы, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі працэсу навучання і выхавання;

– правілы афармлення справаздачнай дакументацыі аб праходжанні практыкі;

*умець:*

– выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– працаваць з юрыдычнай літаратурай і працоўным заканадаўствам, кіравацца нарматыўна-прававымі дакументамі, што звязаны з дзейнасцю ў сферы эстрады;

– фарміраваць мастацкі рэпертуар, распрацоўваць тэматычныя канцэрты;

– ствараць і выконвацьмузычныя праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ствараць камп’ютарныя аранжыроўкі музычных твораў у розных формах, жанрах і стылях акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

*валодаць:*

– сістэмным і параўнальным аналізам асноўных напрамкаў і форм дзейнасці дзяржаўных творчых калектываў;

– якасцямі грамадзянскасці жыцця працоўнага калектыву ўстановы:усе патрабаванні ўнутранага распарадку, аховы працы, тэхнікі бяспекі;

– здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

– метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

*Віды практык*:

| Від практыкі | Дзённая форма атрымання адукацыі | | Завочная форма атрымання адукацыі | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | Курс | Працягласць праходжання, тыдні | Курс | Працягласць праходжання, тыдні | |
| Вучэбная (азнаямленчая) | II | 54 гадзіны (1 тыдзень) | II | 54 гадзіны (1 тыдзень) | залік |
| Вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная) | III | 108 гадзін (2 тыдні) | III | 108 гадзін (2 тыдні) | дыферэнцыраваны залік |
| Вытворчая (педагагічная) | III | 108 гадзін (2 тыдні) | IV | 108 гадзін (2 тыдні) | дыферэнцыраваны залік |
| Вытворчая (пераддыпломная) | IV | 216 гадзін (4 тыдні) | V | 216 гадзін (4 тыдні) | дыферэнцыраваны залік |

Студэнты завочнай формы атрымання адукацыі праходзяць практыку ў міжсесіённы перыяд.

У студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі вучэбная і вытворчая практыкіпраходзяць без адрыву ад навучання.

На працягу вучэбнай і вытворчай практыкі студэнты знаёмяцца з асноўнымі напрамкамі дзейнасці творчага калектыву, матэрыяльна-тэхнічнай базай, вопытам правядзення канцэртаў і арганізацыі канцэртнай дзейнасці. Яны паслядоўна авалодваюць працэсам творчага і даследчага напрамку, вывучаюць артыстычны вопыт, актыўна ўдзельнічаюць у рэпетыцыйнай рабоце, знаёмяцца з вопытам работы кіраўніка, выкладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная і вытворчая практыкі арганізуюцца дэканатам і кафедрамі спецыяльных дысцыплін. Адказны ад кафедры ажыццяўляе кіраванне і кантроль за праходжаннем студэнтамі практыкі, накіроўвае на вытворчую базу, праводзіць устаноўчую і выніковую нарады з практыкантамі. Арганізуе і праводзіць абарону практыкі, на якой прысутнічаюць усе практыканты і кіраўнікі практыкі. Складае справаздачу аб праходжанні студэнтамі практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

Змест практыкі ўключае выканальніцка-даследчую дзейнасць. Студэнт-практыкант наведвае базу практыкі, знаёміцца з дзейнасцю калектыву, прымае ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні канкрэтных мерапрыемстваў. Падчас праходжання практыкі студэнты знаёмяцца з пытаннямі арганізацыі рэпетыцый, канцэртаў.

Змест практыкі заснаваны на працы студэнта ў творчым калектыве базы практыкі па сваёй прафесійнай арыентацыі і грунтоўнасці і ўключае заданні ў форме кантрольных рэпетыцый, урокаў (у якасці музыканта-выканаўцы, вакаліста-саліста, дырыжора, выкладчыка), выканальніцка-даследчую дзейнасць (напісанне рэферата па методыцы кіраўніцтва творчым калектывам). Змест практыкі накіраваны на засваенне новых прафесійных *ведаў, уменняў і навыкаў*:

– прафесійна і метадычна планаваць вытворчы працэс у музычных культурных установах;

– ствараць і праводзіць рэпетыцыйныя, канцэртныя мерапрыемствы, праекты і праграмы;

– авалодваць працэсам творчага і даследчага напрамку;

– засваенне форм і метадаў арганізацыйнай, вучэбна-выхаваўчай работы;

– паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў і навыкаў па прадмеце псіхолага-педагагічнага цыкла і выкарыстанне іх на практыцы ў рабоце з вучнем;

– набыццё навыкаў правядзення ўрокаў;

– азнаямленне з вучэбным рэпертуарам і засваенне прынцыпаў яго фарміравання;

– выпрацоўка творчага і даследчага падыходаў да музычна-педагагічнай дзейнасці, вывучэнне перадавога вопыту і далейшага засваення разнастайных метадаў і сродкаў навучання.

Пастаўленыя задачы ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця мастацкай творчасці, для мастацка апраўданай інтэрпрэтацыі, віртуёзнага выканання музычных твораў, поўнага раскрыцця музычных ведаў, развіцця мэтанакіраванасці, упэўненага мастацкага густу і дасканалага валодання ўсімі тэхнічнымі сродкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўны змест вытворчай практыкі ўключае наступныя кампаненты:

– вывучэнне асобы ўдзельніка творчага калектыву, выяўленне яго здольнасцей, матываў творчай дзейнасці і мадуляванне перспектыў мастацкага росту;

– арганізацыя міжасобасных адносін удзельнікаў калектыву як у малых групах (аркестравыя групы, харавыя, ансамблевыя саставы і г.д.), так і ў рамках усяго калектыву;

– вывучэнне, аналіз і самааналіз арганізацыйна-метадычнага і творчага вопыту, умоў фарміравання і развіцця агульнай культуры будучага кіраўніка і ўдзельніка калектыву;

– удзел у творча-эксперыментальнай і метадычнай рабоце;

– выкананне індывідуальных творчых заданняў і іх практычную апрабацыю ў рэпетыцыйнай, канцэртнай і вучэбнай рабоце базавага калектыву (афармленне партытур, напісанне аранжыровак, інструментовак, пералажэнняў музычных твораў, знаёмства і вывучэнне вучэбна-метадычнай літаратуры ўстановы адукацыі).

Напрамкі дзейнасці ў перыяд праходжання практыкі:

– замацаванне тэарэтычных ведаў;

– авалодванне практычнымі ўменнямі і навыкамі.

**Вучэбная (азнаямленчая) практыка**

*Змест практыкі:*

Наведванне ўстаноў культуры розных тыпаў і кіраўніцкіх структур сярэдніх і спецыяльных устаноў культуры розных узроўняў. Азнаямленне са зместам і асаблівасцямі педагагічнай работы ва ўстановах культуры рознага тыпу. Азнаямленне з комплексам тэхнічных сродкаў устаноў культуры.Азнаямленне з методыкай правядзення індывідуальных, дробнагрупавых і лекцыйных заняткаў. Наведванне мастацкіх калектываў, майстар-класаў і інш.

Апісанне арганізацыйнай структуры базавай установы і сістэмы планавання з пункту гледжання структуры і зместу. Вывучэнне асноўных дакументаў уліку і справаздачнасці базавай установы культуры. Азнаямленне са зместам і асаблівасцямі прадпрымальніцкай дзейнасці ў базавай установе.

*Мэта практыкі* – узмацненне дадзеных ведаў і набыццё новых прафесійных уменняў і навыкаў. Знаёмства студэнтаў з ус-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тановамі культуры і музычнай адукацыі г. Мінска, яго рэгіёнамі і развіццё навыкаў арганізацыі рэпетыцыйна-канцэртнай дзейнасці і выкладання, а таксама атрыманне пачатковага прафесійнага вопыту ў працы.

*Задачы практыкі*:

– знаёмства і аналіз асноўных напрамкаў і форм дзейнасці дзяржаўных творчых калектываў;

– вывучэнне структуры ўстановы сацыякультурнай дзейнасці, асаблівасцей функцыянавання мастацкага калектыву ў межах сваёй спецыяльнасці;

– вывучэнне і аналіз мерапрыемстваў, якія праводзяцца на базе практыкі.

*Базы практыкі:* дзяржаўныя, розных відаў уласнасці творчыя калектывы (аркестр, гурт,прадзюсарскі цэнтр).

*Змест практыкі:*

– вывучэнне структуры ўпраўлення і напрамку дзейнасці ўстаноў культуры і музычнай адукацыі;

– вывучэнне службовых абавязкаў спецыялістаў базавых устаноў;

– аналіз дзейнасці базавых устаноў;

– вывучэнне камерцыйнай дзейнасці базавых устаноў.

У перыяд праходжання практыкі студэнт *павінен:*

– азнаёміцца і апісаць структуру органаў установы культуры;

– азнаёміцца з абавязкамі спецыяліста базавага калектыву;

– азнаёміцца з відамі платных паслуг базавай установы;

– выканаць увесь аб’ём заданняў у адпаведнасці з праграмай практыкі;

– удзельнічаць у грамадскім жыцці працоўнага калектыву ўстановы, выконваць усе патрабаванні яе ўнутранага распарадку і патрабаванніпа ахове працы і тэхніцы бяспекі.

Пасля заканчэння практыкі студэнт у вуснай форме павінен падрыхтаваць справаздачу аб праходжанні вучэбнай практыкі.

**Вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная)практыка**

*Змест практыкі:*

Азнаямленне з кірункамі дзейнасці эстрадных калектываў розных творчых напрамкаў. Аналіз рэпертуару калектыву: жанры, формы і стылі сцэнічных твораў, а таксама індывідуальна-выканальніцкая манера калектыву. Правядзенне аналізу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыйна-творчай работы кіраўніка калектыву. Ацэнка эфектыўнасці форм і метадаў работы кіраўніка з калектывам. Аналіз методыкі правядзення рэпетыцыйнага працэсу. Удзел у рэпетыцыях калектывуў якасці асістэнта рэжысёра. Ацэнка стану метадычнага і тэхнічнага забеспячэння творчага калектыву. Удзел у канцэртнай дзейнасці базавага калектыву.

Вытворчая (рэпетыцыйна-канцэртная) практыка арыентуе студэнтаў на атрыманне прафесіі музыканта-выканаўцы і саліста-вакаліста.

*Задачы вытворчай практыкі:*

– удзельнічаць у рэпетыцыйна-канцэртнай дзейнасці базавага калектыву;

– вывучыць рэпертуар творчага калектыву;

– вывучыць дакументы менеджменту;

– вывучыць складанне агульнай структуры адміністратыўнага кіравання;

– азнаёміцца са штатным раскладам творчага калектыву.

У перыяд практыкі студэнт *павінен:*

– набыць навыкі практычнага выкарыстання ведаў, набытых у час навучання ва ўніверсітэце;

– укараніць навыкі самастойнай работы з мастацкім калектывам;

– развіць сталае творчае мысленне, смелы і ўпэўнены прафесійны падыход да працы;

– прымаць удзел у рэпетыцыях творчага калектыву;

– весці дзённік практыкі і сістэматычнае запаўненне яго;

– аформіць справаздачную дакументацыю па праходжанні практыкі.

Вынікі праходжання вытворчай (рэпетыцыйна-канцэртнай) практыкі абараняюцца ў два этапы:

*1 этап.* Правесці залікова-кантрольную рэпетыцыю на базе практыкі ў якасці музыканта-выканаўцы (напрамку «інструментальная музыка»), вакаліста (напрамку «спевы»).

*2 этап.* Прадставіць у пісьмовым выглядзе:

– індывідуальны план праходжання практыкі;

– дзённік вытворчай практыкі;

– характарыстыку-водгук кіраўніка базавай установы;

– водгук студэнта аб уражаннях праходжання вытворчай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Індывідуальныя заданні**

*Інструментальная музыка:*

1. Развіць навыкі творчай самастойнай работы ў якасці ўдзельніка ансамбля, аркестра.
2. Набыць практыку чытання нот з ліста.
3. Самастойна правесці рэпетыцыю творчага калектыву ў якасці музычнага кіраўніка.
4. Самастойна адрэдагаваць нотны матэрыял з рэпертуару творчага калектыву.
5. Стварыць уласныя аранжыроўкі (адну, дзве) для выканання базавым калектывам.
6. Авалодаць новымі музычнымі інструментамі па напрамку спецыяльнасці«ўдарныя».

*Спевы:*

1. Самастойна зрабіць дзве аранжыроўкі або музычныя пералажэнні эстрадных ці народных песень.
2. Самастойна падрыхтаваць з творчым калектывам уласную аранжыроўку.
3. Выканаць у якасці саліста з творчым калектывам уласную аранжыроўку.
4. Набыць практыку спеваў пад акампанемент ансамбля, аркестра.
5. Набыць практыку чытання нот з ліста.

**Вытворчая (педагагічная) практыка**

*Змест практыкі:*

Наведванне ўрокаў выкладчыкаў дзіцячых школ мастацтваў і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, правядзенне самастойных заняткаў па спецдысцыплінах: скрыпка, віяланчэль, фартэпіяна, альт, труба, трамбон, саксафон, ударныя інструменты, вакал, вакальныя і інструментальныя ансамблі, акцёрскае майстэрства, сцэнічная мова і інш. Аналіз існуючых праграм па спецдысцыплінах для вучняў сярэдняй школы. Распрацоўка канспектаў, авалоданне методыкай арганізацыі правядзення ўрокаў і выхаваўчай работы ў навучальнай установе. Распрацоўка плана-канспекта і правядзенне аднаго пазакласнага мерапрыемства з удзелам вучняў. Правядзенне адкрытага ўрока з вучнем у прысутнасці камісіі. Удзел у арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта практыкі*–падрыхтоўка студэнтаў да самастойнай педагагічнай дзейнасці ў навучальных установах, фарміраванне творчых здольнасцей і якасцей асобы будучых педагогаў, выпрацоўка неабходнасці ў бесперапынным удасканаленні прафесійных уменняў і творчага росту.

*Задачы вытворчай (педагагічнай) практыкі:*

– паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў і навыкаў па дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла;

– паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў, атрыманых пры вывучэнні спецыяльных і агульнапрафесійных дысцыплін і выкарыстанне іх на практыцы ў рабоце з вучнем;

– выхаванне ўстойлівай цікавасці да прафесіі педагога-музыканта, імкненне да педагагічнай самаадукацыі;

– набыццё навыкаў правядзення ўрокаў, арганізацыйнай і камунікатыўнай дзейнасці;

– азнаямленне з вучэбным рэпертуарам і засваенне прынцыпаў яго фарміравання;

– выпрацоўка творчага і даследчага падыходаў да музычна-педагагічнай дзейнасці;

– вывучэнне перадавога вопыту і далейшага засваення разнастайных метадаў і сродкаў навучання.

**Кіраўніцтва вытворчай (педагагічнай) практыкай**

Непасрэднае кіраўніцтва педагагічнай практыкай студэнтаў ажыццяўляецца кіраўнікамі практыкі ад кафедры. Кіраўнік педагагічнай практыкі ад кафедры:

– ажыццяўляе агульнае кіраванне і кантроль за праходжаннем практыкі студэнтамі;

– праводзіць устаноўчую і выніковую нарады з практыкантамі і кіраўнікамі-настаўнікамі;

– арганізуе і праводзіць адкрытыя ўрокі практыкантаў з вучнямі дзіцячых школ мастацтваў і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі;

– складае выніковую справаздачу аб праходжанні і абароне педагагічнай практыкі.

Кіраўнік педагагічнай практыкі ад базавай установы:

– знаёміць студэнтаў з планам сваёй работы, праводзіць адкрытыя заняткі;

– знаёміць студэнтаў з вучнямі свайго класа, іх паспяховасцю, паводзінамі;

– зацвярджае асабістыя планы практыкантаў, кантралюе іх выкананне;

– аналізуе праведзеныя практыкантамі заняткі, вырашае пытанні аб абароне практыкі;

– прадстаўляе кіраўніку практыкі ад кафедры звесткі аб выніках практыкі.

**Дакументы і матэрыялы, якія падаюцца студэнтамі-практыкантамі на абарону практыкі:**

1. Справаздача аб праходжанні педагагічнай практыкі.
2. Індывідуальны план праверкі.
3. Дзённік педагагічнай практыкі з подпісамі кіраўнікоў ад УВА і базы практыкі.
4. Характарыстыка на студэнта-практыканта ад базы практыкі, падпісаная дырэктарам (завучам) навучальнай установы.
5. Псіхолага-педагагічная характарыстыка вучня.

**Вытворчая (пераддыпломная) практыка**

*Змест практыкі:*

Вытворчая (пераддыпломная) практыка з’яўляецца заключным этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста да практычнай дзейнасці. Мэта практыкі – завяршэнне фарміравання прафесійных і арганізацыйных уменняў праз укараняльную дзейнасць студэнта над практычнай часткай сваёй творчай работы. Асноўная задача практыкі: выпрацоўка навыкаў інавацыйнай дзейнасці ў сферах культуры і мастацтва; замацаванне ўсяго комплексу ведаў па дысцыплінах спецыяльнасці ў адпаведнасці з абраным кірункам. Змест практыкі кожнага студэнта вызначаецца індывідуальна. Вынікам практыкі з’яўляецца падрыхтоўка эстрадных кампазіцый, праектаў, падрыхтоўка музычнай, вакальнай, інструментальнай праграмы творчага праекта інструментальнага відовішча.

*Мэта практыкі* – замацаванне ведаў, уменняў і навыкаў, набытых падчас засваення комплексу спецыяльных дысцыплін, а таксама праверка прафесійнай гатоўнасці студэнтаў да самастойнай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вытворчай (пераддыпломнай) практыкі*:

– вывучэнне і аналіз работы кіраўніка творчага калектыву;

– авалодванне метадамі і прыёмамі менеджменту сацыяльна-культурнай сферы;

– авалоданне метадамі і прыёмамі работы з творчым калектывам у якасці кіраўніка;

– аказанне ўсебаковай дапамогі ў правядзенні бягучых планавых мерапрыемстваў творчага калектыву;

– афармленне справаздачнай дакументацыі па праходжанні практыкі.

Студэнт павінен *ведаць:*

– асаблівасці кантрактнай сістэмы: прыём на работу, фінансаванне, ахову аўтарскіх праў;

– формы і сістэму налічэння заработнай платы;

– асаблівасці матэрыяльна-тэхнічнай базы творчых устаноў;

– методыку вядзення дакументацыі;

– методыку падрыхтоўкі кіраўніка да рэпетыцыі;

– методыку правядзення рэпетыцый;

– методыку падрыхтоўкі музыканта-выканаўцы да рэпетыцыі;

– методыку стварэння канцэртных праграм;

– формы і метады самастойнай работы музыканта-выканаўцы, саліста-вакаліста.

*Вынікі* праходжання вытворчай (пераддыпломнай) практыкі абараняюцца ў два этапы:

*1 этап*. Напрыканцы практыкі студэнт-практыкант павінен правесці адкрытую рэпетыцыю на базе практыкі ў якасці музыканта-выканаўцы (для напрамку «інструментальная музыка»), вакаліста (для напрамку «спевы»).

*2 этап*. Прадставіць у пісьмовым выглядзе:

– справаздачу аб праходжанні педагагічнай практыкі (дадатак 1);

– пратакол абмеркавання адкрытай рэпетыцыі (урока) (дадатак 2);

– дзённік вытворчай (педагагічнай) практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Агульнае кіраўніцтва практыкай ажыццяўляецца адказнымі выкладчыкамі на кафедры мастацтва эстрады, якія накіроўваюць і кантралююць студэнтаў, аказваюць ім кансультатыўную дапамогу.

Кіраўніцтва практыкай студэнтаў на базавых установах культуры і музычнай адукацыі ажыццяўляюць вядучыя спецыялісты.

*Абавязкі кіраўніка практыкі ад кафедры:*

– наладжванне кантактаў з базавымі ўстановамі;

– размеркаванне студэнтаў на практыку па базавых установах;

– інфармаванне аб парадку праходжання практыкі, выдача неабходнай дакументацыі;

– правядзенне інструктажу па ахове працы і тэхніцы бяспекі;

– кантроль за ходам і якасцю праходжання практыкі студэнтам;

– выяўленне і ліквідацыя недахопаў у час правядзення практыкі;

– кансультацыя студэнтаў па пытаннях практычнага матэрыялу.

*Адказны кіраўнік практыкі ад базавай установы павінен:*

– прыняць на практыку студэнта і правесці інструктаж па ахове працы і тэхніцы бяспекі;

– саставіць графік праходжання практыкі;

– пракантраляваць якасць работы;

– скласці кароткі водгук аб якасці праходжання практыкі студэнтам.

*Правы і абавязкі студэнтаў-практыкантаў*

*Студэнт абавязаны*:

– у поўным аб'ёме выканаць заданне па праграме практыкі;

– удзельнічаць у выкананні планаў базавай установы;

– выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку;

– выконваць інструкцыі па ахове працы, тэхніцы бяспекі;

– весці дзённік практыкі;

– своечасова падрыхтаваць справаздачную дакументацыю, зацверджаную подпісам і пячаткай ад базавай установы, подпісам кіраўніка практыкі ад кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнт, які не выканаў праграму практыкі па ўважлівай прычыне – накіроўваецца паўторна, у вольны аднавучання час. Студэнт, які без уважлівых прычын не выканаў праграму практыкі або атрымаў адмоўную адзнаку – можа быць адлічаны (акадэмічная запазычанасць).

*Студэнт мае права:*

– па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць у працэсе практыкі, звяртацца да кіраўнікоў практыкі УВА, адміністрацыі;

– паўторна праходзіць практыку без адрыву ад заняткаў па рашэнні савета факультэта;

– уносіць прапановы па арганізацыі практыкі; праходзіць практыку індывідуальна.

*Патрабаванні да афармлення справаздачы*

Падчас праходжання практыкі студэнт ажыццяўляе збор інфармацыі, апрацоўку, сістэматызацыю, аналіз фактычнага матэрыялу.

*Дзённік практыкі* павінен адлюстроўваць звесткі аб выкананні праграмы практыкі і індывідуальных заданняў штодзённа.

Пісьмовая *справаздача* павінна адпавядаць праграме практыкі, змяшчаць апісанне праведзенай работы, вывады і прапановы аб ходзе праходжання практыкі. У справаздачы па практыцы павінны быць адлюстраваны ўсе віды работ, выкананыя ў адпаведнасці з заданнем вытворчай практыкі.Справаздачныя дакументы па практыцы прадстаўляюцца для кантролю не пазней за пяць дзён пасля заканчэння практыкі.

Справаздача падпісваецца студэнтам-практыкантам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

*1.* Арт-менеджменткак вид управленческой деятельности: сб. ст./ под ред. С.Б. Мойсейчук [и др.]. – Минск: Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2011.– 156 с.

*2. Жаркова,Л.С.* Деятельность учреждений культуры: учеб. пособие для студентов вузов культуры и училищ культуры/Л. С. Жаркова. – М.: МГУКИ, 2003. – 233 с.

*3. Капилов, А.Л.* Скрипка белорусская / А.Л. Капилов. – Минск : Беларусь, 1982. – 87с.

*4. Киселева, Т.Г.* Социально-культурная деятельность: учебник/ Т.Г. Киселева, Ю.Д. Красильников. – М.: МГУКИ, 2004. – 539с.

*5. Коломинский, Я.Л.* Психология детского коллектива: система личных отношений / Я. Л. Коломинский. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Нар. асвета, 1984. – 239 с.

*6. Кольцова, М.М.*Двигательная активность и развитие функций мозга ребенка. Роль двигательного анализатора в формировании высшей нервной деятельности ребенка / М. М. Кольцова. – Минск, 1973.

*7. Кузьмина, Н.В.* Способности, одаренность, талант учителя / Н. В. Кузьмина. – Л. :Ленингр. орг. о-ва «Знание» РСФСР, 1985. – 32 с.

*8. Малахова, И. А.*Программа педагогической практики / И. А. Малахова, О. О. Грачева. – Минск : БГУКИ, 2011. – 33 с.

*9. Назайкинский, Е.М.* О психологии музыкального восприятия / Е. М. Назайкинский. – М. : Музыка, 1972. – 197 с.

*10. Новикова, Г.Н.* Технологии арт-менеджмента: учеб. пособие/ Г.Н. Новикова. – М.:Изд. дом МГУКИ, 2006. – 178 с.

*11.* Современные технологии социально-культурной деятельности : учеб. пособие/ отв. ред. Е.И. Григорьева. – Тамбов : Изд-во ТГУ им. Г.Р. Державина,2002. – 504 с.

*12. Чижиков, В.М.* Введение в социокультурный менеджмент: учеб. пособие/ В.М. Чижиков, В.В. Чижиков. – М.: МГУКИ, 2003. – 382 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Бараева, Е.И.* Педагогическая практика: учеб.-метод. пособие / Е.И. Бараева, М.В. Ершова, С.Н. Маковчик. – Минск: РИВШ, 2007. – 99 с.

2. *Жук, О.Л.* Педагогическая подготовка студентов как средство личностно-профессионального развития / О.Л. Жук // Весн. БДУ. Серыя 4,Філалогія, журналістыка, педагогіка.– 2011. – С. 114–120.

3. *Иванова, О.А.* Педагогическая практика студентов как средство развития субъективности личности / О.А. Иванова // Весн. Брэсц. ун-та. Серыя гуманітарных і грамадскіх навук. – 2008. – №4. – С. 108–112.

*4.* Палажэнне абпедагагічнай практыцы студэнтаў / В. М. Ушакова. – Мінск, 2002.

*5.* Педагагічнаяпрактыка / пад. рэд. В.К.Розава. – М.,1981. – 15 с.

*6.* Педагагічнаяпрактыка студэнтаў: вучэб. дапам. /пад рэд. В.П.Таранцея. – Мінск,1991. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДАДАТКІ

*Дадатак 1*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

Кафедра псіхалогіі і педагогікі

Справаздача аб праходжанні педагагічнай практыкі

Прозвішча, імя,імя па бацьку

студэнта_______________________________

гр._____напрамку спецыяльнасці______________________

___________________________________________________

Кіраўнік установы адукацыі/ культуры,

якая з'яўляецца базай педагагічнай практыкі

(подпіс)_____________/_________________

М.П.

Кіраўнік практыкі

ад кафедры псіхалогіі і педагогікі

(подпіс)_____________/ _________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

ПРАТАКОЛ
абмеркавання адкрытай рэпетыцыі (урока)

Студэнт
(ка)________________________________________________
(прозвішча, імя, імя па бацьку)
_________групы факультэта______________________________
спецыяльнасці_________________________________________
напрамку спецыяльнасці__________________________________
______________________________________________________
правёў адкрытую рэпетыцыю (урок) у калектыве
______________________________________________________
(назва творчага калектыву і базавай установы)
з канцэртнай праграмай, складзенай з наступных твораў:

______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________

Камісія ў складзе:
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________

Абмеркавала адкрытую рэпетыцыю (урок) і адзначыла:
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________
Камісія прыняла рашэнне ацаніць самастойную работу студэнта-практыкантаадзнакай___________________________
Члены камісіі:1.______________________
2.______________________
3.______________________

М.П.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*для спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках), напрамкаў спецыяльнасці 1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка), 1-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 0,81. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ